http://edoc.bseu.by/

***С.В. Агароднікава,*** *БДЭУ (Мінск)*

# ДЫКТОЎКА ЯК АДНА З ФОРМАЎ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ ЭКАНАМІЧНЫХ ВНУ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Выкарыстанне розных відаў дыктовак не з'яўляецца самамэтай, як адна з формаў кантролю яно ўяўляе сабой канчатковы этап дзейнасці студэнтаў на прымяненні атрыманых імі ведаў і ўменняў.

Розныя віды дыктовак, узятыя ўвогуле, павінны ўяўляць сабой строгую *сістэму,* у якой патрабаванні, аб'ём матэрыялу кожнай наступнай дыктоўкі фармуюцца на падставе папярэдняй.

*Тлумачальная* дыктоўка мае на мэце праверку якасці засваення найбольш складаных арфаграм і граматычных тэм і г.д. («Правапіс некаторых спалучэнняў зычных», «Склонавыя канчаткі назоўнікаў II склянення» і г.д.).

*Папераджальная* дыктоўка дапамагае выявіць недахопы ў ведах студэнтаў па аваладанні разнастайнымі тэмамі з раздзелаў «Арфаграфія» і «Марфалогія» («Правапіс зычных *дз, дз ц*», «Правапіс суфіксаў дзеясловаў» г.д.)

*Слыхавая* дыктоўка садзейнічае развіццю здольнасцяў да аудзіравання, яе мэтазгодна выкарыстоўваць пры засваенні фанетычных асаблівасцяў беларускай мовы («Правапіс *у-ў*», «Правапіс зацвярдзелых гукаў» і г.д.). Таксама слыхавая дыктоўка праводзіцца дзеля праверкі правільнага выкарыстання стылістычных асаблівасцяў беларускай мовы.

Значнае месца сярод формаў і метадаў кантролю ведаў студэнтаў займае *зрокавая* дыктоўка. Яе мэтазгодна прапаноўваць пасля правядзення тлумачальнай і папераджальнай дыктовак для замацавання ведаў па разнастайных раздзелах беларускай мовы і эканамічнай тэрміналогіі. Да вышэйнададзенага неабходна дадаць, што менавіта гэты від дыктоўкі спрыяе развіццю зрокавай памяці навучэнцаў.

*Слоўнікавая* дыктоўка праводзіцца дзеля замацавання ведаў студэнтаў па засваенні асобных лексічных тэм. Гэты від работы можна ўжываць з мэтай праверкі ведаў студэнтаў па эканамічнай тэрміналогіі.

*Кантрольная* дыктоўка з граматычным заданнем мае на мэце праверку ведаў студэнтаў па засваенні разнастайных упарміраваных лексічных, граматычных і сінтаксічных сродкаў беларускай літаратурнай мовы.